ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "ЗАСЛАЎЕ"

вул. Рынкавая, д. 8а, 223036, г. Заслаўе, Мінская вобласць, Беларусь

тэл.: +375-17-5177613 e-mail: gkmz@zaslaue.by https://www.zaslaue.by/

**ІНФАРМАЦЫЯ**
**для мастакоў, аўтараў, куратараў,**
**па правядзенню на базе Запаведніка праектаў (выставы, акцыі, імпрэзы, фэсты і г.д.)**

Для арганізацыі і правядзення праекта неабходна даслаць на электронную пошту *nea@zaslaue.by* з пазнакай “*Заяўка на праект*” наступныя матэрыялы:

Ліст-заяўку ў адвольнай форме з наступнай інфармацый:

від праекта (выстава, акцыя, імпрэза, фэст і г.д.);
куратары/-кі, аўтары/-кі, удзельнікі/-цы праекта, агульныя звесткі пра іх (пералік раней праведзеных выстаў, найбольш вядомыя працы і г.д.);
кантактныя асобы з пазначэннем электроннай пошты, тэлефона і інш.;
тэрміны правядзення праекта;
месца правядзення праекта (экспазіцыйна-выставачны комплекс, аб’екты “Кузня” і “Этнаграфічны комплекс «Млын»”, Музей беларускай маляванкі, Музей “ДАП”, Дзіцячы музей міфалогіі і лесу);
кароткая канцэпцыя праекта;
колькасць работ, прадметаў, якія плануюцца да экспанавання, іх выявы;
тэхнічныя патрабаванні да экспазіцыйнага абсталявання, выставачнай залы, месца правядзення праекта і г.д.

Заяўка на правядзенне праекта на наступны год падаецца да канца лістапада бягучага года. У асобных выпадках заяўка можа быць пададзеная пазней, пажадана не менш, чым за два месяцы да мяркуемай даты правядзення праекта.